**Алімпіяда па вучэбных прадметах “Беларускайя мова” і “Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)” у 2019/2020 навуч. годзе (4 клас)**
**Код удзельніка_____**

1. А) Укажы, колькі разоў гук [а] сустракаецца ў сказе.

**Аднойчы, калі моцна разгулялася мяцеліца, нехта пастукаў у акно.** ____

Б) Разгледзь “чароўны квадрат”. У ім па гарызанталі і па вертыкалі схаваны назвы прысмакаў. Адшукай і запішы іх. Падкрэслі ў словах літары, якія абазначаюць няпарныя звонкія зычныя гукі.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ц | у | ф | е | р | к | а |
| а | п | е | р | н | і | к |
| з | б | а | к | п | в | в |
| е | а | с | т | і | а | р |
| ф | д | в | о | р | ф | ж |
| і | м | ё | д | о | л | а |
| р | ш | ф | у | г | і | т |

________________________________
________________________________
________________________________
________________________________
________________________________

2. Замяні кожны сказ адным словам. Запішы, вызнач род назоўнікаў.

1) Знак у выглядзе металічнага кружка
для ўзнагароды за асаблівыя заслугі, подзвіг.____________________
2) Буйная вадаплаўная птушка
з доўгай шыяй, свойская або дзікая.__________________________
3) Сакавіты плод яблыні.____________________________________
4) Афрыканская жывёліна
з вельмі доўгай шыяй і доўгімі нагамі.________________________
5) Свойская жывёліна, якая выкарыстоўваецца
для вартаўнічай аховы, на паляванні.__________________________

3. Разгледзь схемы саставу слова. Пад кожнай схемай запішыце словы, якія ёй адпавядаюць.

Узлесак, лясны, лес, мора, заморскі, марскі; смешны, смех, насмешка; вада, падводны, вадзіца.

|  |  |  |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

4. Перакладзі на беларускую мову:

На яблоне созрело красное яблоко. ______________________________

5. Устаў словы, як патрабуе сэнс.
Сцены фарбуе - _____________. Карціну піша - _____________ .
Цэглу кладзе - _______________. Кнігі пераплятае - _________________ .

6. Бацьку Арцёма завуць Віталій, бацьку Дашы – Ігар, а бацьку Тані – Юрый. Запішы поўныя імёны і імёны па бацьку дзяцей.

___________________________________________________________________

___________________________________________________________________

___________________________________________________________________

7. А) Летам Тамара гербарый сабрала.(М.Пазннякоў)




Б) Шуміць ля ракі чарот шапаткі.( М.Пазнякоў)




**Схема якога сказа адлюстравана няправільна? Адказ запішы. _____**

8. Падкрэслі прозвішчы беларускіх пісьменнікаў.
А. Ліндгрэн, А. Пушкін, Н. Гілевіч, С. Маршак, У. Ліпскі, А. Барто, А. Вольскі.

9.Дапішы беларускія прымаўкі.
А) Кожная птушка сваё ________________________________________ .
Б)Новых сяброў набывай, але ________________________________________ .
В) Чалавек без Радзімы, што ____________________________________.

10. Прачытай твор.

Хто самы добры?

Каля пешаходнага перахода на гулкай гарадской вуліцы паспрачаліся сябры-трэцякласнікі Ваня, Пеця і Алесь.

– Я самы добры, – сказаў Ваня. – Я вельмі шкадую старых людзей. Яны часта такія бездапаможныя!

– Я самы добры, – не пагадзіўся з Ванем Пеця. – Я вельмі шкадую адзінокіх старых людзей. Ім іншы раз пагаварыць няма з кім.

– Я самы добры… – пачаў Алесь.

Але Ваня перапыніў яго:

– Ты лепей памаўчы. Учора задачу па матэматыцы не даў спісаць. З-за цябе перад настаўніцай прыйшлося апраўдвацца.

– Так, так, – падтакнуў Пеця.

– Самому трэба рашаць задачы. Будзеш спісваць – ніколі матэматыку не вывучыш, – ціха прамовіў Алесь.

З-за рога дома, мацаючы металічным кіем дарогу, выйшла сівая жанчына і накіравалася на пешаходны пераход.

А па дарозе суцэльным патокам машыны імчацца, злосна гудуць.

– Куды яна ідзе? – усклікнуў Ваня. – Зялёны агонь святлафора яшчэ не загарэўся.

– У яе кепскі зрок! – здагадаўся Пеця. – Мама неяк казала, што людзі з кепскім зрокам заўжды ходзяць з кіямі.

Стаяць Ваня і Пеця, дзівяцца. А Алесь падбег да жанчыны і дакрануўся да яе рукі.

– Пачакайце, не пераходзьце дарогу! Зараз я вас перавяду. Вы мне дазволіце?

Жанчына павярнула галаву да хлопчыка і ўсміхнулася. Калі б яна чула нядаўнюю спрэчку, то, напэўна, здагадалася б, хто тут самы добры.

А вы здагадаліся?

А. Якімовіч

Выканай заданні.

1. Да якога жанру адносіцца твор? Гэта ________________________

2. Аб чым спрачаліся хлопчыкі? Запішы.____________________________
_____________________________________________________________

3. Чаму Алесь не даў Ваню спісаць задачу па матэматыцы? Знайдзі і падкрэслі адказ у тэксце.

4. З дапамогай слоў-дзеянняў аўтар перадаў перажыванні хлопчыкаў за жанчыну. Запішы імёны хлопчыкаў:

1) усклікнуў ____________________________________
2) здагадаўся ____________________________________
3) стаіць ________________________________________
4) дзівіцца_______________________________________
5) падбег ________________________________________
6) дакрануўся ____________________________________

5. Прачытай прыказкі. Вызначы, якая з іх падыходзіць да дадзенага твора?

☐ Не цані чалавека па твары, а цані па душы.
☐ Добраму чалавеку і чужая хвароба да сэрца.
☐ Добрую справу добры чалавек ладзіць.

6. Каго з хлопчыкаў можна назваць самым добрым? Чаму?
_____________________________________________________________
_____________________________________________________________

7. Запішы галоўную думку твора. ______________________________________
_____________________________________________________________
_____________________________________________________________